**Міцкевіч Н.А.,**
*суіскальнік кафедры рэжысуры свят*

# КАРНАВАЛІЗАЦЫЯ ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ГЛЕДАЧА Ў СВЯЦЕ

У навуковым і агульнакультурным ужытку ёсць паняцце — “духоўныя традыцыі народа”. У вузкім значэнні — гэта народныя абрады, звычаі, музычны фальклор, народныя святы. Названы пласт духоўнай культуры народа ў складанай форме адлюстроўвае светаўспрыманне чалавека, сістэму дзеянняў — урачыстых рытуалаў, абрадавай варажбы, святочных карнавалаў. Усе яны скіраваны на забеспячэнне будучыні, працяг свядомага жыцця чалавека ў наступных пакаленнях. Роля гэтага пласта духоўнай культуры ў гісторыі чалавецтва, захаванні этнасу розных краін надзвычай вялікая.

Абрады і звычаі полісастаўныя па структуры. Яны ўяўляюць неад’емную частку народных свят, карнавалаў, уключаюць шэраг атрыбутыўных элементаў; суправаджаюцца гульнямі, танцамі, сцэнічнымі дзеяннямі, варажбой. Ва ўсіх выпадках абрады і звычаі звязаны з лёсам чалавека, яго спадзяваннямі.

Рытуал, гульня — састаўныя часткі свята, якое мае форму пэўнага тэатральнага відовішча: шэсцяў, гульняў, дэманстрацый, парадаў і інш. Кожная гістарычная эпоха мяняла іх змест, прыёмы арганізацыі, рэжысуру.

Святы патрэбны ўсім, яны будуць у любым грамадстве, але цяпер, на жаль, мала-памалу страчваюць элемент таямнічасці, які быў добра знаёмы нашым продкам і рабіў іх незабыўнымі. Карнавал быццам квяцісты кілім: тут пераплятаюцца нябеснае і зямное, рытуал і непасрэднасць, традыцыя і раскаванасць, багацце і беднасць, адзінота і згуртаванасць, розум і стыхія.

У карнавалах на нейкі час аб’ядноўваюцца супраць-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

легласці, ламаецца звыклы рытм жыцця. Перад удзельнікамі адкрываецца магчымасць дакрануцца да таямніцы вытокаў існага, цяга да гармоніі вядзе да трыумфу над хаосам.

Як жа актывізаваць гледача ў свяце? Што за ролю выконвае гратэск пры стварэнні абраду, рытуалу, карнавалу?

Паспрабуем адказаць на гэтыя пытанні, разглядаючы прыклады. Свята каляд — адно са свяг, якіх хрысціянскі свет чакае з асаблівай радасцю, імкнецца сустрэць вельмі ўрачыста. Горад і вёска, стары і малы — усе старанна рыхтуюцца да свята.

З калянымі святамі звязаны народныя звычаі, што існуюць са старажытных часоў; да іх адносяць хаджэнне са "звяздой" і лялечныя прадстаўленні, якія называлі "батлейка", яны падобныя на ўкраінскія, вядомыя пад назвай "вертэп". Хаджэнне са "звяздой" пачыналася з вечара 25 снежня, працягвалася да Новага года, у некаторых мясцінах — да Вадохрышча.

Цэнтральнае месца ў навагоднім абрадавым цыкле займае абрад калядавання, абход двароў аднавяскоўцаў пераапранутымі ўдзельнікамі свята, што выконваюць абрадавыя песні. Звычай пераапранання ў беларусаў, як і ў іншых славянскіх народаў, захаваў некалькі масак, генетычна звязаных з раннімі формамі рэлігіі. Асабліва гэты момант свята падкрэсліваў гратэск. Галоўная маска навагодняга пераапранання — каза (казёл), распаўсюджаная таксама ў паўднёвых рэгіёнах Расіі, Украіны, Малдавіі, Балгарыі, Чэхаславакіі. Ваджэнне "казы" суправаджалася абавязковым выкананнем песень, драматызаванымі прадстаўленнямі.

"Каза" прыбіралася наступным чынам: кажух, вывернуты поўсцю наверх, апраналі рукавом на канец дугі, што ўстанаўлівалася выпукласцю ўніз. Рукаў завязвалі — ён служыў шыяй і галавой, да якой прымацоўваліся рогі, зробленыя з саломы або асакі. Да другога канца дугі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прывязвалі хвост таксама з саломы. Невысокага росту і спрытны ў танцах хлопец залазіў пад кажух, выконваючы ролю казы. "Казу" суправаджала цэлая світа пераапранутых. За павадыра ці дзеда быў хлопец высокага росту, які ўмеў складна гаварыць. Яго апраналі ў старое адзенне, а на спіне рабілі горб; хлопцу прымацоўвалі бараду з пянькі ці лёну, у адну руку яму давалі табакерку, у другую — вялікі посах. У "свіце" павінна была быць і "маладзіца". На такую ролю падбіралі шчуплага хлопца. Ён быў апрануты ў жаночую кашулю з вышыванымі рукавамі, андарак. На шыю яму вешалі ўпрыгожанні, на галаву завязвалі хустку, сажай падмазвалі бровы. У кампаніі калядоўшчыкаў заўсёды прысутнічалі "цыган", апрануты ў сіні армяк, падпяразаны вяроўкай, з бізуном у руцэ, размаляваным вугалем тварам, механоша, музыкант, запявала, некалькі спевакоў.

Аналізуючы лепшыя вобразы народнай смехавай культуры на Беларусі, трэба адзначыць іх таленавітую непасрэднасць, што мяжуе з дзіцячым прастадушшам. Тут і гратэск наіўны, светлы. Самі маскарадныя маскі каляднага карнавалу з'яўляліся ўдзельнікамі не столькі абрадавага дзеяння, колькі бытавой гульні, забавы. Аб гэтым сведчаць бытавыя персанажы, якія ёсць у святочным маскарадзе: афіцэр, пані, гандляр, цыган, яўрэй, маскі жывёл, не звязаныя з аграрным рытуалам і, нарэшце, агульны жартоўна-вясёлы карнавальны настрой прадстаўленняў з "казой".

Па наяўнасці моцнага гульнявога элемента гратэск у калядным карнавале бліжэй да мастацка-вобразных формаў, у прыватнасці тэатральна-відовішчных. А тыя імкнуцца да народна-вулічнай карнавальнай культуры на мяжы мастацтва і жыцця. Па сутнасці ўсё гэта — жыццё, што існуе ў гульнявым абліччы.

Калядны карнавал актывізуе гледача праз гратэск, дае свабоду імправізацыі. Задача ж рэжысёра пры стварэнні карнавалу вялікая, адказная. Час паварочвае даўнейшыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрады да народа, іх святло азарае душу народа. У гэтым азарэнні прысутнічае духоўная сіла, якая можа адрадзіць культуру нашай нацыі.

Галоўнае ў карнавалізаваных ігрышчах — пераапранутыя. Акрамя таго, немалую ролю адыгрываюць спаборніцтвы.

Разнастайнасць карнавальных формаў, рытуалаў, гульняў выявіў калядны карнавал, здзейснены пастановачнай групай кафедры рэжысуры Беларускага універсітэта культуры ў Светлагорску. Галоўным рэжысёрам яго быў П.А.Гуд, мастаком — Г.Г.Сокалаў-Кубай, музычным кіраўніком — А.М.Аляхновіч. Адкрывала калядны карнавал урачыстая кавалькада Шчодры і музыкаў, якія ў акружэнні зазывал забаўлялі народ.

Рытмічная музыка, спевы шчадровак разбуралі сцяну адчужанасці паміж выканаўцамі і гледачамі. Нараджаліся чыстасардэчнасць, непасрэднасць. Музыцы належала вялікая роля ў карнавале, яна была стымулам актывізацыі гледача, "лепшым сябрам" рэжысёра.

Дададзім, што мізансцэна ў карнавале не статычная групоўка, а працэс уздзеяння часу на прастору. Да пластычнага пачатку ў ёй існуе пачатак часавы, г.зн. рытмічны, музычны. Паколькі калядны карнавал — чаргаванне статыкі і дынамікі розных узроўняў, надзвычай насычаную эмоцыямі форму ўяўляла ў нашым выпадку прадстаўленне пераапранутых.

Маскі Цыгана, Каня, Кабылы, Жорава, Зайца ўпрыгожвала Калядная зорка — сімвал каляд. Рытуальнае "ваджэнне казы" выконвалася ў асяроддзі гледачоў, сярод драматызаваных дзеяў распаўсюджана была калядная гульня "Жаніцьба Цярэшкі".

Калядны карнавал у Светлагорску адкрыў у гратэску яркі стыль, што ўражваў сваёй кантрастнасцю. Быццам россып рознакаляровых кветак на снезе, узнікалі калядныя карагоды ("Зайчык", "Грушка"), варажба з пеўнем, скокі ("Мяцеліца", "Лявоніха", "Жабка",

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Трасуха"), гульні малых формаў ("Яшчур", "Зязюля", "Гусары"), конкурс на лепшыя Шчодру, творчую ініцыятыўную групу.

Магічнае мысленне ў калядным карнавальным дзеянні выклікала нараджэнне гуртоў, у якіх актывізацыя гледача даходзіла да апагея. Карнавалізацыя пачыналася са стварэння касцюма, уключала абрад калядавання, хаджэння калядных гуртоў па хатах. Там узаемаабмен спевамі, танцамі, пачастункамі адлюстроўваў высокія прынцыпы ідэйнай натхнёнасці карнавальнага мастацтва.

Карнавал мае вялікае значэнне для кансалідацыі людзей, для іх мастацка-эстэтычнага, маральнага выхавання.

Карнавальнае мастацтва не толькі выказвае настрой чалавека. Яно выяўляе яго творчыя, арганізацыйныя здольнасці, веды, жыццёвы вопыт, вопыт паводзін. Безумоўна, творца карнавалу павінен даваць гледачу інфармацыю палітычнага, культурнага, выхаваўчага характару.

Рэжысура карнавальнага дзеяння будуецца па сваіх законах.

Пры гэтым смела выкарыстоўваюцца гіпербала, шарж, фантастычная трансфармацыя і інш. Карнавал — арганізацыя прасторы і музычнага дзеяння, стыхія гратэскавай вобразнасці. У ім спалучаюцца рэальнае з нерэальным, прастадушны гумар з жартоўным здзекам, камізм і трагізм.

Карнавал узнікае там, дзе існуюць духоўныя сувязі між людзьмі. Яго святочная культура арганізацыйна выяўляецца ў выглядзе абраду, рытуалу, гульні, спаборніцтва ці складанага цырыманіялу, разгортваецца ў вольны ад працы час. Карнавал — цэнтр жыццядзейнасці грамадства. Ён эстэтычна арганізуе час чалавека, суадносіць яго з рытмам сацыяльна-гістарычнага жыцця, прыроды (космасу); прыўносіць элементы паўнаты, цэласнасці, гармоніі, прыгажосці. Асновай цэласнасці з'яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гратэск наравісты, капрызны, вычварны, мудрагелісты, у якім сумяшчаюцца элементы сатыры, фантастыкі, шаржу, умоўнасці.

**Вайцюк Л.А.,**
*аспірантка кафедры*
*харавога мастацтва*

## АБ ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ПАДЛЕТКАЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Сацыяльная, эканамічная, палітычная, культурная сітуацыі, што склаліся цяпер у нашым грамадстве, патрабуюць пераацэнкі самой сутнасці працэсу выхавання падрастаючага пакалення. Гэта правамерна таму, што ва ўмовах агульнага крызісу ідэй заўсёды адбываецца перагляд асноўных паняццяў педагогікі, перш за ўсё паняцця выхавання.

Шматлікія пераўтварэнні ў грамадстве далі магчымасць педагогам пераасэнсаваць работу з дзецьмі, падлеткамі, абнавіць характар, змест, тэхналогію выхаваўчай работы. Гэтаму садзейнічаюць асноўныя прынцыпы сучаснай дзяржаўнай палітыкі ў галінах выхавання, адукацыі. Яны знайшлі сваё адлюстраванне ў законах “Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб правах дзіцяці”, ва ўстаноўленым Міністэрствам адукацыі “Прыкладным палажэнні аб агульнаадукацыйнай школе”, распрацаваных Нацыянальным інстытутам адукацыі “Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Беларусі”, “Канцэпцыі выхавання ў нацыянальнай школе Беларусі”. Новыя сацыяльна-эканамічныя, культурна-педагагічныя ўмовы патрабуюць новых падыходаў, тэхналогій. Апошнія павінны адпавядаць сучаснаму моманту, цяперашнім грамадскім каштоўнасцям.

У сацыяльным, культурным жыцці беларускага грамадства адбываецца адраджэнне нацыянальных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ